*М. А. Бяспалая*
(Мінск)

# Сучасныя тэндэнцыі ў камплектаванні фондаў рэгіянальных музеяў як працяг традыцый Я. і К. Тышкевічаў

Дзейнасць Я. і К. Тышкевічаў па фарміраванні калекцыі, якая складала ядро Віленскага музея старажытнасцей, стала амаль хрэстаматыйным прыкладам для музейных спецыялістаў. Стварэнне яе супала з перыядам, у якім відавочна праяўляўся ўплыў ідэй Асветніцтва аб магчымасці тлумачэння заканамернасцей сацыякультурнага развіцця рацыянальным шляхам. Збіральніцкая праца братоў Тышкевічаў вызначалася сістэмнасцю ў адборы прадметаў, якія вызначаліся інфарматыўнай ці мастацкай вартасцю, што абумоўлівала выкананне імі навукова-асветніцкай і адукацыйнай функцый. Асноўную частку музейнай калекцыі Я. і К. Тышкевічаў складалі прадметы, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак ці вандровак па беларускім краі. Менавіта яны – галоўнае ядро музея старажытнасцей. Шырокавядомая выява памяшкання музея дае ўяўленне аб выглядзе і функцыянальным прызначэнні экспазіцыйнай прасторы, якая дазваляе адкрыты доступ да выстаўленых прадметаў, што, у сваю чаргу, сведчыла аб выкананні музеем прызначаных функцый і адпавядала працэсам развіцця музейнай справы ў перыяд жыцця братоў Тышкевічаў.

Ці маюцца падставы разглядаць дзейнасць амаль 140 сучасных рэгіянальных музеяў Рэспублікі Беларусь як працяг справы заснавальнікаў першага беларускага музея? Адказ на пастаўленае пытанне можа быць адназначна станоўчы. Супрацоўнікі рэгіянальных музеяў пры папаўненні фондаў, якія налічваюць каля 2,4 млн музейных прадметаў, дзейнічаюць на падставе той жа матывацыі – даследчай, эстэтычнай, сацыякультурнай; улічваюць тыя ж уласцівасці – інфарматыўнасць, рэпрэзентатыўнасць пры набыцці прадметаў музейнага значэння; карыстаюцца тымі ж метадамі (арганізацыя навуковых экспедыцый, набыццё прадметаў за грошы), якімі карысталіся Я. і К. Тышкевічы. Безумоўна, задачы і магчымасці камплектавання фондаў сучасных музеяў значна шырэйшыя, ды і сацыякультурныя ўмовы зусім іншыя ў параўнанні з перыядам дзейнасці Тышкевічаў, тым не менш галоўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

музейныя прынцыпы выразна праяўляюцца і складаюць стрыжань працэсу камплектавання.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў галоўнай задачай музейнай дзейнасці прызнавалася дакументаванне гісторыка-культурнай спадчыны музейнымі сродкамі, аднак з працэсам актыўнага ўключэння музеяў у сацыякультурную дзейнасць мяняецца ўяўленне аб задачах музея. Але ж захаванне і папаўненне фондаў, іх апрацоўка застаюцца па-ранейшаму важнейшымі. Аб гэтым сведчаць распрацоўка і ўдасканаленне заканадаўчай базы, якая мае прамое дачыненне да музеяў і музейнага фонду Рэспублікі Беларусь і рэгулюе яго камплектаванне.

Задачы фарміравання калекцый матэрыяламі сучаснасці можна аднесці да адных з найбольш складаных у музейнай практыцы. Гэта абумоўлена, у першую чаргу, тэмпам сучаснага жыцця (хуткая змена працэсаў і з’яў, якія адбываюцца ў грамадстве). Не так даўно мы ведалі, што такое харчовыя талоны і купоны, а цяпер іх можна знайсці нават не ва ўсіх музеях; 20–25 гадоў таму толькі пачалі з’яўляцца камп’ютарныя класы ў школах, а сёння ўжо змянілася не адно пакаленне камп’ютараў, амаль выйшлі з ужытку дыскеты і г.д.

Асаблівая складанасць звязана з камплектаваннем музейнага збору, які раскрывае сацыякультурны стан сучаснага грамадства, таму што крытэрыі адбору набываюць дваісты характар. З аднаго боку, трэба разглядаць важнасць дадзенага прадмета (на момант ацэнкі) для сучаснага соцыуму, а з другога – улічваць музейную каштоўнасць прадмета. Вядома шмат выпадкаў, калі пэўным прадметам, з’явам ці традыцыям надавалася вялікае значэнне, але ў далейшым адбывалася іх негатыўная пераацэнка соцыумам альбо, наадварот, многія з’явы, асабліва ў галіне мастацтва, атрымлівалі прызнанне праз дзесяцігоддзі і нават стагоддзі пасля стварэння, што адлюстроўвае нераўназначнае наданне каштоўнасці аднаму і таму ж прадмету (з’яве) рознымі соцыумамі. Прычым яно праяўляецца як па вертыкалі, так і па гарызанталі. У першым выпадку – гэта адрозненні ва ўспрыманні каштоўнасцей людзьмі розных пакаленняў, але адной і той жа культуры, у другім – адрозненне ў ацэнцы важнасці прадмета (з’явы і г.д.) рознымі (па культурна-нацыянальных і сацыяльна-эканамічных прыкметах) групамі аднаго і таго ж соцыуму ў дадзены гістарычны час.

Каб наблізіцца да вырашэння гэтай праблемы, супрацоўнікі музеяў праводзяць анкетныя апытанні, бяруць інтэрв’ю, ужываюць іншыя апрабаваныя методыкі сацыялагічнага даследавання, якія дазваляюць высветліць грамадскае меркаванне наконт гістарычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значымасці сучасных падзей і прадметаў музейнага значэння, што найбольш выразна іх адлюстроўваюць. Выкарыстоўваюцца таксама экспертныя ацэнкі, каштоўнасныя прыярытэты, распрацаваныя спецыялістамі ў профільных для музея галінах. У сучасных умовах магчымасць шырокага выбару прымушае шукаць і выпрацоўваць адпаведнае разуменне значнасці музейнага прадмета, усебакова разглядаць кожны сучасны прадмет, перш чым зрабіць заключэнне аб яго музейным значэнні і мэтазгоднасці адбору для фондаў музея.

Выключна важна захаваць прынцып мемарыяльнасці: музейныя прадметы набываюць больш высокую значнасць і каштоўнасць пры выяўленні аўтара ці ўладальніка. У гэтым выпадку інфармацыйнае поле крыніцы пашыраецца не толькі з дапамогай самой інфармацыі, але і эмацыянальна.

У сучасных умовах неабходна шукаць і выпрацоўваць адпаведнае разуменне значнасці музейнага прадмета. Дадзеная выснова зыходзіць з факта хуткага развіцця новых з’яў у сучасным сацыякультурным асяроддзі, якія фарміруюцца пад уплывам інфармацыйна-камп’ютарнай і мультымедыйных тэхналогій. Гэты працэс відавочны, адбываецца штодня і штогадзінна, прыцягвае ўсё больш шырокія сацыяльныя і ўзроставыя групы, асабліва моладзь. Выяўляецца гэта, па трапным выразе расійскага культуролага В. А. Кутырова, у тым, што «ўсюды тое самае апранаюць, ядуць, п'юць, спяваюць, усюды Дыснэйлэнд і Макдоналдс. Своеасаблівасць народаў сыходзіць у мінулае, у традыцыю, у фальклор і існуе як перажытак мінулага. Калі б у гарадах не было старых кварталаў і музеяў, то падарожнічаць было б зусім бессэнсоўна – чалавек непазбежна трапляе ў асяроддзе аднолькавых аўтамабіляў, дызайн-будынкаў, яго паўсюдна пераследуюць рэкламы транснацыянальных карпарацый. Чалавек ператвараецца з сацыяльна-культурнай асобы ў чалавечы фактар тэхнасу» [4, с. 243].

Прымаючы да ўвагі дадзеную характарыстыку сучаснага грамадства, тэарэтычныя распрацоўкі па гэтай праблеме, мы падтрымліваем пункт гледжання аб прэваліраванні на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця сацыяльнай функцыі музея над вядучымі да гэтага часу навукова-даследчай і ахоўнай(дакументавання). У чым жа выяўляецца сацыялізацыя музейнай дзейнасці? У першую чаргу ў яе публічнасці, таму што нават ахоўная функцыя набывае рысы максімальна магчымага допуску наведвальнікаў да музейных фондаў з мэтай атрымання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самага, па магчымасці, шырокага ўяўлення пра іх структуру, змест дзейнасці, значэнне. Гэта значыць, што нават такі дастаткова закрыты напрамак дзейнасці музея, як фондавы, аб'ектыўна ўключаецца ў працэс актуалізацыі ўсіх праяў культуры.

Адбор музейных прадметаў знаходзіцца на стыку навукова-даследчай і ахоўнай функцый. Гэты працэс неверагодна ускладніўся, паколькі сучасная культура лічыць значным і годным зрабіць часткай культурнай спадчыны любую праяву чалавечай дзейнасці. Гэта значыць, што абсалютна любы прадмет годны стаць музейным экспанатам. У такой сітуацыі музейныя работнікі арыентуюцца пры адборы не на саму рэч (яе кошт, эстэтызм, рэпрэзентатыўнасць), а на яе магчымасць транслiраваць (перадаваць) культурныя сэнсы і асацыяцыі. Чым больш знакавай з'яўляецца рэч, тым большая верагоднасць яе музеефікацыі.

З адказаў супрацоўнікаў рэгіянальных музеяў на распаўсюджаную сярод іх анкету можна вызначыць асноўныя праблемныя пытанні ў выкананні функцыі дакументавання сучаснасці. Праблема, якую адзначылі ўсе рэспандэнты, – гэта недахоп фінансавання. Па гэтай прычыне ў рэгіянальных музеях распаўсюджаны такія формы набыцця прадметаў музейнага значэння, як дарэнне, стварэнне копій па заказе музея, закупка прадметаў музейнага значэння на дзяржаўныя сродкі. Да гэтага можна дадаць такую форму работы, як наладжванне сувязей, кантактаў з уладальнікамі цікавых прадметаў, рашэнне пытанняў спадчыны, завяшчання і інш. Мядзельскі музей народнай славы, напрыклад, выкарыстоўвае такія формы, як сустрэчы з былымі работнікамі розных гаспадарчых сфер, асабістыя кантакты, магчымасці сродкаў масавай інфармацыі.

У пошуках шляхоў найбольш аптымальнага вырашэння праблем камплектавання фондаў прадметамі сучаснасці музейныя спецыялісты наладжваюць часовыя і пастаянныя кантакты з асобамі і арганізацыямі, якія могуць быць ці з'яўляюцца ўладальнікамі прадметаў музейнага значэння. Гаворка ідзе аб калекцыянерах, мастаках, фатографах і іншых творчых работніках; аб органах улады і кіравання, грамадскіх аб'яднаннях і арганізацыях; аб прадпрыемствах, дзе праектуюцца і выпускаюцца прадметы народнага спажывання і вырабы мастацкіх промыслаў; аб антыкварных і букіністычных крамах, манетных дварах, навуковых установах, якія збіраюць калекцыі, але не займаюцца іх захоўваннем, і г.д. Такая методыка дзейнасці рэгіянальных музеяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па фарміраванні музейных збораў, якія адлюстроўваюць сучаснасць, цалкам апраўдана.

Другая праблема, якую паднімаюць рэспандэнты, – гэта адставанне музеяў у набыцці прадметаў музейнага значэння «па гарачых слядах» і адсутнасць аператыўнага рэагавання на змены, якія адбываюцца ў жыцці грамадства наогул і рэгіёна ў прыватнасці. Мы лічым, што ў фарміраванні музейных збораў вялікую ролю адыгрывае так званы чалавечы фактар, таму што толькі спецыяліст з музейнай або профільнай адукацыяй у стане зразумець змест і кірунак сучасных сацыякультурных працэсаў. Грунтоўным падмуркам для гэтага можа служыць як агульная эрудыцыя, так і веданне новых тэндэнцый, якія маюць месца ў профільнай навуцы. Злучэнне гэтых дзвюх якасцей, безумоўна, садзейнічае правільнай арыентацыі ў адборы музейных прадметаў сучаснасці.

Важную ролю чалавечага фактара ў працэсе музейнага збіральніцтва можна праілюстраваць на прыкладзе дзейнасці М. П. Ліхачова, якая разглядаецца сучаснымі музеязнаўцамі як «павучальны ўзор этыкі і метадалогіі індывідуальнага вучонага збіральніцтва, калі яно носіць эўрыстычны характар і распаўсюджваецца на нязведаную, цалінную вобласць, калі збіральнік выступае ў адной асобе як знаўца гісторыі сусветнай культуры, бібліёграф, які валодае методыкамі эўрыстыкі і апрацоўкі прадметаў, пачуццём пошуку, дыпламат, які ўмее весці справы па ўсім свеце з гандлярамі і іншымі збіральнікамі па перапісцы і асабіста, экспазіцыянер з абдуманымі музейнымі поглядамі» [2, с. 299]. Безумоўна, супрацоўнік рэгіянальнага музея не мае магчымасці падняцца да такіх вяршынь, але нельга адмаўляць, што ў рэгіянальным маштабе ён з’яўляецца адначасова збіральнікам і дыпламатам, гісторыкам-краязнаўцам і экспазіцыянерам, акрамя гэтага выконвае многія іншыя абавязкі.

Не выпадкова ў анкетах сустракаецца пажаданне музейных работнікаў атрымаць рэкамендацыі па адборы прадметаў музейнага значэння ў калекцыі рэгіянальных музеяў па сучасным перыядзе. Зрабіць гэта дастаткова складана, таму што неабходна аб’яднаць два моманты: першы – добра знаёмы музейным спецыялістам прынцып адбору, галоўнай умовай і адначасова крытэрыем якога з’яўляецца аб’яднанне ўласцівасцей і каштоўнаснай характарыстыкі прадмета. Гэты момант не выклікае ніякіх нараканняў і цяжкасцей. Але другі, што мае непасрэднае дачыненне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да вызначэння і адлюстравання сацыякультурнага зместу сучасных падзей, вылучэння крытэрыяў, якія дапамогуць іх задакументаваць, вызначыць найбольш характэрныя рысы, асаблівасці, стварае шмат праблем. Тут як раз і трэба задзейнічаць навуковы і практычны патэнцыял музейных супрацоўнікаў, браць за аснову ацэнкі сітуацыі, прапанаваныя профільнай навукай, хаця і ў гэтым выпадку зусім не выключаны прадузятыя падыходы да адбору прадметаў музейнага значэння.

У якасці выразнай характарыстыкі ўплыву сучасных сацыя-культурных умоў і ўзроўню дасягненняў профільнай навукі на прынцыпы адбору музейных прадметаў лічым магчымым спаслацца на меркаванне прызнанага аўтарытэта ў музейнай справе дырэктара Дзяржаўнага Эрмітажа М. Б. Піятроўскага: «… у сучасных расійскіх умовах праблема гістарычнай памяці і, у прыватнасці, памяці культурнай для Расіі перманентна балючая. Перш за ўсё, таму, што ў пераломныя моманты розных эпох, з аднаго боку, ставіцца пад сумненне сам факт неабходнасці існавання гістарычнай памяці самой па сабе, а з другога – адначасова – памяць становіцца прадметам кан’юнктурных спекуляцый: запатрабуюцца тыя фрагменты мінулага, якія найбольш “зручныя” ў тым ці іншым сацыяльным кантэксце. Імкненне да захавання, адраджэння памяці ў Расіі, акрамя таго, асабліва балючае, паколькі лічыцца панацэяй ад сацыяльных хвароб, народжаных камуністычным ладам і яго наступствамі. З гэтага вынікае цяга да іманентнай фальсіфікацыі – прыдумвання “сваёй” памяці, якая цяпер добрая. Адсюль – характэрная прыкмета існавання гістарычнай і, быць можа, у першую чаргу, культурнай памяці ў Расіі: яе міфалагізацыя».

У прынцыпе мы згодны з такой характарыстыкай гісторыка-культурных працэсаў сучаснасці, якая шмат у чым вызначае падыходы да распрацоўкі крытэрыяў адбору прадметаў сучаснасці ў музейны збор. За прынцып камплектавання неабходна ўзяць адбор матэрыялаў, якія характарызуюць не толькі поспехі і дасягненні ў розных напрамках сучаснага развіцця, але і складанасці і негатыўныя моманты.

У гэтай сувязі хацелася б выказацца з нагоды фарміравання калекцый па гісторыі савецкага грамадства. На наш погляд, работнік музея павінен абстрагавацца ад усіх кан’юнктурных спекуляцый, бо аб'ектыўнае дакументаванне мінулага – вышэй за іх. Па гэтай прычыне неабходна прызнаць унікальнасць і ў той жа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

час, на шчасце, непаўторнасць, як бы мовіць, у чыстым выглядзе таго сацыяльнага эксперымента, які працягваўся больш за 80 гадоў на велізарнай тэрыторыі, што аб’ядноўвала мноства самых разнастайных сацыяльных груп і культур. Нягледзячы на значную колькасць літаратуры па гэтым перыядзе нашай гісторыі, візуальнае знаёмства з ім больш эмацыянальнае і таму больш запатрабаванае. Пра гэта сведчыць цікавасць да выстаў па савецкім перыядзе, хаця ў многіх рэгіянальных музеях адпаведныя экспазіцыі неяк раставарыліся, амаль што зніклі.

Прывядзём некалькі цікавых, на наш погляд, прыкладаў з дзейнасці рэгіянальных музеяў у гэтым кірунку. Лідскі гісторыка-мастацкі музей стварыў выставу пад назвай «Хрушчоўка 60-х», якая атрымала шырокі рэзананс сярод наведвальнікаў, у прэсе і Інтэрнэце. У Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі вялікую цікавасць выклікала выстава старых ёлачных цацак, на якой было прадстаўлена 250 упрыгожванняў розных эпох з розных краін. Самая старая – з канца XIX ст. Рарытэтамі можна лічыць не толькі, напрыклад, дрэздэнскія аб'ёмныя цацкі з кардону або дарэвалюцыйныя расійскія, але і ёлачныя цацкі, выпушчаныя савецкай прамысловасцю 1960–70-х гг. Асаблівую цікавасць выклікалі цацкі з савецкай сімволікай.

Са сказанага вынікае яшчэ адна праблема: хто будзе і павінен выступаць у якасці эксперта і вызначаць, якія прадметы музейнага значэння будуць найбольш выразна адлюстроўваць нашу сучаснасць у будучым? Пераважная колькасць рэспандэнтаў з рэгіянальных музеяў правільна лічыць , што гэта павінны рабіць музейныя спецыялісты. У якасці экспертаў, на думку некаторых з іх, могуць выступаць калекцыянеры, навукоўцы, выкладчыкі ВНУ.

Яскравым прыкладам дакументавання сучаснасці сталі падзеі па захаванні і выратаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў чарнобыльскай зоне, хаця і ў гэтым працэсе праявілася своеасаблівае адставанне музеяў у адборы прадметаў музейнага значэння па «гарачых слядах». Першыя спробы па ліквідацыі наступстваў гэтай катастрофы для гісторыка-культурнай спадчыны былі распачаты асобнымі прадстаўнікамі навукі і культуры ў канцы 1980-х гг. А ў 1991 г. Саветам Міністраў БССР была створана Дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з дзяржаўнай экспедыцыяй на тэрыторыі Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка ў 1991–2010 гг. праводзілі збор матэрыялаў супрацоўнікі Брагінскага гістарычнага музея, у выніку якой была сфарміравана этнаграфічная калекцыя, а на падставе фотаархіва створана выстава «Подых Чарнобыля праз 25 год». Ельскім краязнаўчым музеем асобныя экспедыцыі праводзіліся з 1992 г., напрыклад, у 2010 г. былі арганізаваны дзве экспедыцыі ў пакінутыя вёскі. Нараўлянскім этнаграфічным музеем за перыяд з 2001–2010 гг. было наладжана больш за дзесяць экспедыцый у зону адсялення [1, с. 62–63].

Супрацоўнікі дзяржаўнай экспедыцыі наладжвалі сумесныя паездкі ў зону з Музеем старажытнабеларускай культуры Інстытута этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі і Беларускім дзяржаўным музеем архітэктуры і побыту. На аснове сабраных у зоне адсялення прадметаў 26 красавіка 1996 г. у Музеі старажытнабеларускай культуры быў адчынены экспазіцыйны раздзел «Помнікі этнаграфіі і народнага мастацтва чарнобыльскай зоны». Між тым, нягледзячы на актыўную работу, у 2001 г. дзяржаўная камісія спыніла сваю дзейнасць [1, с. 60–61].

Можна адзначыць, што за перыяд з 1986 г. па 2011 г. большасць рэгіянальных музеяў, размешчаных у пацярпелых раёнах, праводзілі работу па выратаванні гісторыка-культурнай спадчыны Усходняга Палесся, аднак значны недахоп вылучаемых бюджэтных сродкаў і вынікаючая з гэтага тэхнічная неабсталяванасць з'яўляюцца асноўнай праблемай на шляху да выратавання пакінутай спадчыны.

Тэматыка камплектавання фондаў музея залежыць перш за ўсё ад яго профілю. Гэта ж тычыцца і камплектавання матэрыялаў па сучасным сацыякультурным развіцці грамадства.

Найбольшыя складанасці ўзнікаюць у музеяў гістарычнага профілю і комплексных (краязнаўчых), паколькі тэматыка камплектавання тут будзе значна шырэй.

Важнае значэнне набываюць пры гэтым прадметы, якія характарызуюць найважнейшыя падзеі і даты ў развіцці як нашай дзяржавы ў цэлым, так і канкрэтнага рэгіёна ў прыватнасці. Напрыклад, пры адборы прадметаў сучаснасці фондава-закупачнай камісіяй прыярытэты аддаюцца дакументам і прадметам, якія характарызуюць і адлюстроўваюць такія падзеі, як выбары розных узроўняў, перапіс насельніцтва, рэспубліканскае свята «Дажынкі» і інш. – гэта ўлёткі, агітацыйныя плакаты, пасведчанні, таксама і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльныя прадметы, што маюць адносіны да гэтых падзей, памятныя падарункі (кнігі і гадзінніі для ўдзельнікаў), значкі, запрашальныя білеты і інш.

Камплектаванне прадметамі сучаснасці адпавядае прынятым у музейнай практыцы кірункам (тэматычны, сістэматычны) і ажыццяўляецца ў такіх формах, як закупка, дарэнне, абмен, мэтавы заказ, сістэматычны збор матэрыялаў на пастаянных аб'ектах. Але часам яно праходзіць у выглядзе разавай акцыі і носіць аператыўны характар. Такім з'яўляецца камплектаванне «па гарачых слядах», сутнасць якога заключаецца ў арганізацыі і правядзенні збіральніцкай працы на месцы якой-небудзь падзеі ў момант яго здзяйснення або адразу пасля яго. Гэта можа быць збіральніцкая праца падчас з'ездаў, канферэнцый, выбараў органаў дзяржаўнай улады, закладкі і адкрыцця помнікаў і мемарыяльных комплексаў, значных палітычных падзей і інш.

Расійскія музейшчыкі правамерна звяртаюць увагу на неабходнасць збору матэрыялаў, якія раскрываюць месца розных катэгорый людзей на прыступках сацыяльнай лесвіцы, доступ іх да самых неабходных матэрыяльных даброт. Вельмі важнай з'яўляецца тэма ўзаемаадносін улады (дзяржавы) і асобы. Музеі зацікаўлены ў тым, каб мець матэрыялы пра тое, што ўлада давала чалавеку (напрыклад, у савецкі час – адукацыя, сацыяльнае забеспячэнне, медыцынскае абслугоўванне, жыллё, магчымасць кар'ернага росту і інш.), чым заахвочвала чалавека (узнагародамі, павышэннямі па службе і інш.). Збіраецца матэрыял аб цэнзуры, аб парушэнні права чалавека выказваць свае погляды, аб адносінах улады і грамадзян да неартадаксальных дзеячаў культуры і іх твораў, збіраюцца выданні нелегальныя і замежныя, матэрыялы аб дысідэнтах.

У сферу інтарэсаў музеяў пры фарміраванні збораў уваходзяць матэрыялы аб ролі жанчын у грамадстве, аб маладзёжных субкультурах, аб духоўным жыцці людзей розных перыядаў ХХ ст., іх ідэалах і магчымасцях; звяртаецца ўвага на змены вобраза станоўчага героя ў літаратуры, мастацтве, збіраюцца матэрыялы аб старых і новых традыцыях.

Можна вылучыць наступныя крытэрыі адбору прадметаў сучаснасці ў музейныя зборы:

профільны – адпавядае профільнай накіраванасці музея,

тэматычны – адпавядае папаўненню пэўнай тэматыкі,

калекцыйны – адпавядае калекцыйнай структуры фонду музея,

мемарыяльны – звязаны з дасягненнямі канкрэтнай асобы,

галіновы – адлюстроўвае развіццё пэўнай галіны,

рэгіянальны – адлюстроўвае сацыякультурнае развіццё пэўнага рэгіёна,

падзейны – звязаны з рознымі падзеямі, памятнымі датамі і г.д.,

сацыякультурны – раскрывае асаблівасці сучаснай сацыякультурнай сітуацыі і звязаны з адлюстраваннем становішча розных сацыяльных груп, грамадскіх аб’яднанняў, гендэрнай палітыкі, субкультур моладзі, новых традыцый і г.д.

Неабходна канстатаваць той факт, што ў Рэспубліцы Беларусь пакуль не распрацавана дзяржаўная праграма камплектавання музейных калекцый сучаснасці. Можна прапанаваць некалькі варыянтаў, зыходзячы з замежнага вопыту. Напрыклад, шведскі варыянт: ствараецца агульнадзяржаўнае сховішча, у якім назапашваюцца прадметы музейнага значэння па сучасным развіцці. Штат супрацоўнікаў утрымліваецца на дзяржаўныя сродкі. У будучым плануецца задавальняць заяўкі дзяржаўных музеяў з гэтага фонду. Мадэль, безумоўна, цікавая, таму што сродкі не распыляюцца, ідэя збіральніцтва аднастайная, але для нашых умоў, верагодна, падыходзіць не зусім. Чаму? На наш погляд, з-за разнастайнасці музейнай сеткі, рэгіянальных адрозненняў і спецыфікі.

Другі прыклад звязаны з камплектаваннем фондаў літаратурных музеяў па сучасным развіцці літаратурнага працэсу. Як адну з найбольш эфектыўных формаў фінскія даследчыкі называюць інтэрв’юіраванне пісьменнікаў. Такая праграма дзейнічае ў Хельсінкскім універсітэце з 1971 г. Быў складзены апытальнік, які налічваў каля 500 пытанняў на розныя тэмы: сям’я і сваякі, дзяцінства, школьныя гады, кар’ера, творчы працэс, манера пісьма. Літаратуразнаўцамі робіцца аўдыязапіс інтэрв’ю, які перадаецца ў фонды музеяў. На наш погляд, такая форма можа паспяхова выкарыстоўвацца і ў дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў, прычым сучасныя магчымасці дазваляюць зрабіць не толькі аўдыя-, але і відэазапіс інтэрв’ю.

Дэтальна прапрацаваўшы пытанні камплектавання фондаў літаратурных музеяў матэрыяламі па сучаснасці, расійская даследчыца А. К. Ламунова прапануе пашырыць пералік пастаянных крыніц камплектавання і дадаць да іх выдавецтвы і рэдакцыі. Звычайна матэрыяламі, якія назапашваюцца ў такіх установах, камплектуюць свае фонды архівы. Тым не менш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдавецтвы і рэдакцыі захоўваюць дакументы, якія могуць быць цікавымі і для музеяў: аўтарскія рукапісы, рэцэнзіі, перапіску пісьменніка з рэдакцыяй, выдавецкі дагавор з аўтарам і інш. [3, с. 27]. Часткова такія матэрыялы трапляюць у музейныя фонды з асабістымі архівамі пісьменнікаў, але лічым перспектыўным наладзіць такое камплектаванне на пастаяннай аснове.

Такім чынам, ствараемыя сучасныя музейныя калекцыі павінны максімальна поўна прадстаўляць ўсю праблематыку, што ўваходзіць у кола інтарэсаў музея, усю тэрыторыю рэгіёна і раскрываць асноўныя праблемы ў канкрэтных прасторы і часе. Музейны збор павінен даць магчымасць падаць мінулае цікава, прывабна для наведвальнікаў. Гэта патрабуе пошукаў адпаведных мемарыяльных прадметаў, рарытэтаў. Музей павінен звярнуць пільную ўвагу на сучасныя актуальныя праблемы, паколькі людзі псіхалагічна не могуць абстрагіравацца ад штодзённых імгненных праблем. Для гэтага музейныя работнікі павінны актыўна асвойваць ужо прапанаваныя гісторыкамі новыя падыходы да ацэнкі сучаснасці, працаваць над удасканаленнем канцэпцый камплектавання фондаў.

Вызначэнне важнейшых прынцыпаў і выбар асноўных кірункаў камплектавання фондаў музея залежаць перш за ўсё ад профілю і навуковай накіраванасці музея. Акрамя таго, на тэматыку камплектавання ўплываюць задачы, якія звычайна ставяцца перад музеем, змены, якія адбываліся і адбываюцца ў сучасным жыцці.

Такім чынам, разгледжаная праблема з'яўляецца настолькі актуальнай, з аднаго боку, з другога – настолькі шматпланавай, што яе адкрытае абмеркаванне ў шырокіх колах навуковай супольнасці проста неабходна.

1. *Кавалёў, Я. А.* Дзейнасць рэгіянальных музеяў па выратаванні і зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны Усходняга Палесся ў постчарнобыльскі перыяд / Я. А. Кавалёў // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь : стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук-практ. канф., Мінск, 24 ліст. 2011 г. / рэдкал. : М. А. Бяспалая (старш.) [ і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2012. – С. 60–63.

2. *Климанов, Л. Г.* Музейныя взгляды и практика Н. П. Лихачева // Л. Г. Климанов : материалы Междунар. науч. конф., Санкт-Петербург, 14–16 мая 2008 г. ; отв. редактор А. В. Майоров. – СПб., 2009. – С. 298–306.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Ломунова, А. К.* Комплектование фондов литературных музеев материалами по современности / А. К. Ломунова. – М., 1988. – 27 с.
4. *Ольшевская, Г. К.* Новые критерии комплектования музейных фондов. Историко-антропологический подход / Г. К. Ольшевская // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоветский период / отв. ред. И. В. Чувилова. – СПб. : Алетейя, 2009. – С. 241–246.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ